**Навагодняе**

Зімы завейна-белы карагод
Зблудзіў у цемярэжніку лазовым —
І снегу зноў няма пад Новы год,
Як дабрабыту нашага асновы.

Так, не шанцуе роднае зямлі:
Стагоддзямі жыве яна ў скрусе ...
Адзінае падолець мы змаглі:
Вярнуць з вякоў ёй назву Белай Русі!

Але свайго не выракся народ,
І гурт сыноў Айчыны не радзее!
А снег?..
Ён выпаў зноў пад Новы год,
Якраз тады, як вершацца надзеі ...
Гайда ў вазок, і хай капыціць конь,
Сякуць у твар мароз І вецер шчодра
Вітаць калядны вечар — дух Пагонь,
Бо не з мячом мы едзем
а на Шчодры!...

Чаруй мяне — ты створана
Для гэтай грэшнай дзеі:
І вочы ў колер ворана,
І стан — глыток надзеі.

Масці да сэрца словамі
Кароценькую сцежку,
Каб стаў я зачараваны
Пітвом тваёй усмешкі!

Чаруй, каб стала самая
Жаданая навечна,
Бо ў душы таксама я
У нечым небяспечны...

Пакуль на плоце чыстая даёнка
У ранішняй дрымоце падсыхае —
На небасхіл за поўняй наўздагонку
Акраец сонца росны выплывае...

Такое паўтараецца штолета,
І мне здаецца ў ранішняй дрымоце:
Зусім не сонца правіць гэтым светам,
А тая, што вісіць пакуль на плоце...

Белы снег, а на ім снегіры,
Як жывыя, гарачыя кроплі ...
Не маўчы, я прашу, гавары,
Хоць размова не выдасца цёплай.
Нас вянчала не лета — зіма,
Не арэлі люлялі — сумёты,
Ты казала пра гэта сама,
Не адразу, бясспрэчна, а потым ...
Потым шмат было розных падзей,
Наракаліся спрэчкі і слёзы,
Не гублялі мы толькі надзей,
Вінавацілі, праўда, морозы ...
Ты казала пра гэта сама,
Не адразу, бяспрэчна, а потым:
Нас вянчала не лета — зіма,
Не арэлі люлялі — сумёты ...
Не маўчы і цяпер, гавары,
Хоць размова не выдасца цёплай.
Белы снег, а на ім снегіры,
Як жывыя, гарачыя кроплі ...

А хто там ідзе...
Янка Купала

Калі збіраліся да Бога,
Было не шмат нас, але многа ...
Чаму ж цяпер нас столькі мала?
Дорога стомленых прыбрала ...

Ды засталіся, ацалелі,
І Ты ў душы, і Воля ў целе ...
На Нёмне мы, Дзвіне і Сожы,
І звон-набат гучыць у кожным!

Мы прыйдзем іншым на падмогу,
Калі збіраюцца да Бога ...

Разліўся лівень раніцай над пожняй,
І дажынаем мы нанесеныя страты:
Непрадказальнасць дня вісіць над кожным,
Ці непавінны ён, ці ў нечым вінаваты ...

Мо гэта й добра: ад дзесятка свечак
Заўжды зыходзіць лёгкае дыханне:
Непрадказальнасць дня не пакаранне,
А сродак засяродзіцца на вочным!..